**“Мы беларусы, мы – народ такі!”**
**Квіз для вучняў 8–11-х класаў, прысвечаны Году добраўпарадкавання**

**Таццяна Анатольеўна Марцэвіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Ёдкаўскай СШ Лідскага раёна

**2025 год аб’яўлены Годам добраўпарадкавання. Прапанаваны квіз для вучняў 8–11-х класаў дапаможа зразумець, што беларусы ўкладваюць у гэта паняцце, якія працоўныя традыцыі падтрымліваюць, да каго ставяцца з павагай. Мерапрыемства ўключае пытанні, звязаныя з народным побытам, гісторыяй беларускага народа, яго стараннямі па паляпшэнні якасці жыцця ў розныя перыяды, у тым ліку пасля Вялікай Айчыннай вайны, утрымлівае прыказкі, загадкі, звязаныя з працай. Гэты матэрыял дапаможа задумацца, што сёння карыснага можа любы малады чалавек зрабіць для сваёй краіны і роднага дому.**

**Мэты:** пашырэнне ўяўленняў і ведаў вучняў пра сістэму працоўных, грамадзянскіх і культурных традыцый беларускага народа; садзейнічанне развіццю інтэлектуальных здольнасцей; выхаванне высокамаральнай асобы, здольнай працаваць на карысць роднай краіне, дапамагаць людзям, усяму жывому.

**Удзельнікі:** 2 каманды з ліку вучняў 8–11-х класаў.

**Абсталяванне:** лісты з заданнямі квіза, ручкі.

## Ход квіза

### I. Арганізацыйны этап

**Слова настаўніка.** Вядома, што узровень жыцця, якасць і камфорт кожнага беларуса залежаць ад сумеснай працы і неабыякавага стаўлення кожнага грамадзяніна да свайго роднага дома, малой радзімы, Рэспублікі Беларусь. Так склалася гістарычна, што беларус заўсёды быў добрым гаспадаром, гасцінным суседам. Сёння пасільны ўклад кожнага ў добраўпарадкаванне свайго месца пражывання, адпачынку, працы – гэта працяг шматвекавых традыцый нашага народа. Добраўпарадкаванне – гэта вельмі важны працэс, што ўключае цэлую сістэму мерапрыемстваў, якія дазваляюць сфарміраваць адказны погляд і ўмацоўваюць грамадзянскую самаўсвядомленасць, прымушаюць яшчэ раз з гонарам сказаць: “Мы беларусы, мы – народ такі!”

**ІІ. Асноўны этап**

**Першы тур**

1. Пра якую прыладу працы ў беларусаў ёсць загадка: "Як у лес ідзе, то на хату глядзіць, а як дахаты ідзе, то на лес глядзіць"?

2. Рэспубліканскае свята працаўнікоў вёскі і народнае свята ў гонар заканчэння жніва, падчас якога апошні сноп з поля памяшчалі на самае пачэснае месца ў хаце – покуць (чырвоны кут).

3. Масавая працоўная акцыя, у якой прынялі ўдзел 425 тысяч чалавек, якая ў СССР упершыню прайшла 1 мая 1920 года з удзелам Уладзіміра Ільіча Леніна.

4. "Алмаз ведаў", які ў пачатку 2000-х гадоў у Беларусі будавалі 5000 спецыялістаў, 30 прадпрыемстваў, студэнты розных ВНУ.

5. Расліна, якая шырока выкарыстоўваецца для вырабу паклі – матэрыялу для тэхнічных работ.

6. З імем якога дзяржаўнага дзеяча часоў БССР звязана будаўніцтва Мінскага метрапалітэна?

7. Якому герою твора Якуба Коласа "Новая зямля" належаць мары-думкі?

Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх не кіне,
Зямля – аснова ўсёй айчыне.

8. Дзень тыдня, у які ў праваслаўнай традыцыі прынята наведваць і добраўпарадкаваць магілы памерлых продкаў, маліцца за іх у храме.

9. Прыгадайце радок Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, у якім ужываецца лексема "працавіты".

10. Птушка, якую згадвае ў сваім нарысе "Зямля пад белымі крыламі" Уладзімір Караткевіч як сімвал добрага гаспадара і апекуна беларускай зямлі: "на вільчыках сялянскіх хат, на дрэвах, на калонах старых разбураных палацаў, на слупах капліц сярод маладога зялёнага жыта".

11. Якое значэнне мае фразеалагізм "вароты пірагамі падпёрты"?

12. Пазнайце нацыянальную страву па рэцэпце: мука жытняя – 400 г; вада – 430 г.

13. З якім насякомым асацыіруецца ўстойлівы выраз "працуе як …"?

14. Дробныя лясныя ягады, назва якіх паходзіць ад слова “ніцы”, ім неабходна шмат разоў “пакланіцца”, каб сабраць, а затым зварыць духмянае варэнне.

15. Звычай дзяліцца свежым мясам і салам з суседзямі і сваякамі, якія дапамагалі рэзаць кабана.

16. Выберыце з прапанаваных лексем адно лішняе слова, якое не адносіцца да тэматычнай групы “прылады працы і прадметы побыту”: *веялка, ночвы, таўкач, верцер, саха, рыззё, пранік, дымар, кнот*.

17. Якую назву беларускага горада неабходна ўставіць у пасведчанне “Індывідуальная кніжка аднаўлення …”, што выдавалася пасля Вялікай Айчыннай вайны людзям, якія дапамагалі адбудоўваць дамы, прадпрыемствы і іншыя будынкі?

18. Выява на пяцірублёвай купюры, рэшткі цэнтральнай умацаванай часткі старажытнага горада, якая была сядзібай князя або яго намесніка і мела ваенныя, адміністрацыйныя і палітычныя функцыі.




**Адказы:** *1. Сякера. 2. Дажынкі. 3. Суботнік. 4. Нацыянальная бібліятэка. 5. Лён. 6. Машэраў П. М. 7. Міхал. 8. Субота. 9. Мы ў працавітай, вольнай сям’і. 10. Бусел. 11. Багатае, прывабнае месца. 12. Хлеб. 13. Мурашка. 14. Суніцы. 15. Свежына. 16. Рыззё. 17. Мінск. 18. Дзядзінец.*

## Другі тур

1. Веснавое народнае свята, пасля якога гаспадар мог рабіць новую або рамантаваць старую агароджу ці пачынаць ворыва. А ўбачыць бусла ў палёце ў гэты дзень – азначала быць “лёгкім на ногі” цэлы год.

2. Пра які месяц гаворыцца ў прыказцы: “Як настане …, у гаспадара поўна гумно і кішэнь”?

3. Вобласць сучаснай Беларусі, на тэрыторыі якой у XVIII стагоддзі пры Аўгусце III пачалі вырошчваць бульбу.

4. Якую жывёлу-карміліцу падчас куплі выбіралі па прыкметах: мае доўгі хвост, худую шыю, тонкую скуру і тоўстыя жылы на жываце?

5. Як у беларусаў адным словам гучыць выраз “усердно, старательно выполнять какую-либо работу”?

6. Якой раслінай (на малюнку) беларусы чысцяць каміны?



7. Дзе сёння ў Беларусі будуецца Цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі?

8. З імем якой беларускай святой звязана будаўніцтва ў XII стагоддзі ў Полацку Спаса-Праабражэнскай царквы, работы па будаўніцтве якой былі праведзены ў рэкордны для таго часу тэрмін – 30 тыдняў?

9. Якая прылада працы ў беларусаў называлася “літоўкай”, бо рабілі яе ў Вілейцы?

10. Выберыце неабходны працяг прыказкі: “Дождж не тады ідзе, калі просяць, а тады, калі …”:

1) зіма яшчэ далёка;

2) сена косяць;

3) трава зялёная.

11. Дзень перад Вялікаднем на Вербным тыдні, калі беларусы прыводзілі ў парадак хату, надворак, пачыналі выпякаць велікодныя булкі, фарбавалі яйкі і мыліся ў лазні.

12. Замак на тэрыторыі Беларусі, які быў закладзены М. К. Радзівілам Сіроткам у 1582 годзе, сёння ўнесены ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

13. Якія сімвалы на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь увасабляюць працу і багацце, што ствараюцца рукамі чалавека?

14. Народная артыстка Беларусі і Савецкага Саюза (на фота), якая апекаалася кветнікамі на плошчы Перамогі ў Мінску, пераможца гарадскога конкурсу па азеляненні.



15. Адна з ініцыятыў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі па вытворчасці электрычнай і цеплавой энергіі, рэалізацыя якой пачалася на тэрыторыі Гродзенскай вобласці ў 2013 годзе.

16. Народны пісьменнік БССР (на фота), які пад вокнамі свайго дома ў Мінску некалькі гадоў запар засяваў жытам лапінку зямлі велічынёю з пісьмовы стол.



17. Кампазіцыя, якая складаецца з яблыневай квецені ў спалучэнні з чырвона-зялёнай стужкай. Кветка яблыні тут сімвалізуе агульнанародную радасць усіх пакаленняў беларусаў у сувязі з вызваленнем Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Днём Вялікай Перамогі.

18. Мемарыяльны комплекс на месцы колішняй вёскі ў Лагойскім раёне Мінскай вобласці Беларусі, у якім у 2023 годзе адкрылі новы музей і аднавілі царкву са званіцай.

**Адказы:** *1. Дабравешчанне. 2. Верасень. 3. Гродзенская. 4. Карова. 5. Завіхацца. 6. Ядловец. 7. Брэсцкая крэпасць. 8. Ефрасіння Полацкая. 9. Каса. 10. Сена косяць. 11. Чысты чацвер. 12. Нясвіжскі замак. 13. Вянок з каласоў, пераплецены з ільном і канюшынай. 14. Галіна Макарава. 15. Будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі. 16. Якуб Колас. 17. Бутаньерка. 18. “Хатынь”.*

### Трэці тур

1. Адна з самых працяглых вуліц Еўропы і ўпрыгожанне нашай сталіцы, якую пасля Вялікай Айчыннай вайны будавалі каманды з розных гарадоў і нават краін. Большая частка жылых будынкаў была ўзведзена з прыцягненнем спецыялістаў з горада-пабраціма Ленінграда на ўзор асобных будынкаў Неўскага праспекта.

2. Падчас правядзення рэспубліканскага суботніка на месцы якога будучага будынка Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкам была закладзена капсула часу з пасланнем нашчадкам?

3. Матэрыял з брацкіх магіл, мемарыялаў, помнікаў, абеліскаў і месцаў баявых дзеянняў Беларусі, які размешчаны ў крыпце Храма-помніка ў гонар Усіх Святых у Мінску.

4. Назавіце па-беларуску прадмет для будаўніцтва, які неабходна ўставіць у прыказку замест шматкроп'я: “У гаспадарцыі і … спатрэбіцца”.



5. Дрэва, сімвал мужнасці гаспадара, якое выкарыстоўвалася для пабудовы дома, вырабу мэблі, музычных інструментаў, хатняга начыння.

6. Які месяц у беларусаў да 1492 года лічыўся пачаткам Новага года і быў звязаны з пачаткам гаспадарчых работ?

7. Што агульнага ў псеўданімах “святланосных” беларускіх пісьменнікаў XIX стагоддзя: *Мацей Бурачок* (сапраўднае прозвішча Ф. Багушэвіч), *Янка Лучына* (сапраўднае прозвішча І. Неслухоўскі), *Карусь Каганец* (сапраўднае прозвішча К. Кастравіцкі)?

8. Месяц, у якім беларусы калісьці трапалі і часалі каноплі ці лён, ад чаго на зямлю ападала шмат адходаў.

9. Хто аўтар (на фота) вершаваных радкоў: “Мы беларусы, мы – народ такі”?



10. Складзіце і ўстаўце неабходнае слова ў радкі твора У. Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”: “Мабыць, з-за гэтага … і кранальнай сваяцкай, кроўнай любові да зямлі – беларус і дагэтуль пераважна аратай, земляроб”.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| р | а | б | ц | а | п | с | л | т | а | в | ю |

11. Пазнайце беларускую народную казку па пачатку: “Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць. Дастаў торбачку, развязаў і пачаў есці. Выходзіць з лесу галодны воўк. Бачыць – касец пад кустом сядзіць і нешта есць. Падышоў да яго воўк:

– Ты што ясі, чалавеча?”

12. Якое значэнне мае слова *бабка*, што ўжываў у сваім маўленні касец з казкі “Лёгкі хлеб”. Выберыце з некалькіх лексічных значэнняў адно неабходнае: Бабка – 1. Тое, што і баба. 2. Сталёвая кавадлачка для кляпання

касы. 3. Грыб з цёмна-бурай шапкай на высокай ножцы. 4. Дзесяць снапоў, састаўленых у кучку для прасушкі і накрытых распасцёртым снапом. Падказка на фота:



13. За што народны мастак Беларусі Аляксандр Кішчанка (на марцы) быў занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса?




14. Што ўзвялі ў 1969 годзе на месцы “Мінскага катла” – падзеі ліпеня 1944 года?

15. “Талака” – гэта не толькі ансамбль танца, музыкі і песні. Першапачатковае значэнне гэтага слова найлепш раскрываецца ў радках песні на словы Леаніда Пранчака, які адзначыў, што талака “не пакіне ў бядзе сябрука”. Што азначае гэта слова?

16. У Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту можна ўбачыць аж тры такія канструкцыі (на фота), прычым розных тыпаў: казлоўку, шатроўку і пальтрак. Пра што ідзе гаворка?




17. Пра які промысел распавядае ўздымшчык (на фота): “Нашы сосны, як каровы: адна добра доіцца, а другая не. З адной вядро за сезон сабраць можна, а другую дзяўбеш, дзяўбеш, рэжаш шэсць абходаў – кубарыка нават няма”?



18. Якая дата адзначаецца штогод ва ўсім свеце 22 красавіка і заклікае кожнага чалавека прызнаваць калектыўны абавязак, жыць і дзейнічаць у гармоніі з прыродай, з тым, каб дзейнасць у эканамічнай, сацыяльнай і экалагічнай сферах не наносіла шкоду яе кампанентам і забяспечвала захаванне зямлі для будучых пакаленняў?

**Адказы:** *1. Праспект Незалежнасці. 2. Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. 3. Зямля. 4. Цвік. 5. Дуб. 6. Сакавік. 7. Усе псеўданімы маюць значэнне "прыстасаванне для асвятлення хаты" (Бурачок – ад назвы агародніны, у якой беларусы ў мінулым рабілі паглыбленне для лучыны ці свечкі; Лучына – тонкая сухая, звычайна доўгая сасновая шчэпка, якой даўней асвятлялі сялянскія хаты; Каганец – пасудзіна з тлушчам і кнотам пасярэдзіне для асвятлення жылля). 8. Кастрычнік. 9. Р. Барадулін. 10. Працалюбства. 11. "Лёгкі хлеб". 12. Бабка – дзесяць снапоў, састаўленых у кучку для прасушкі і накрытых распасцёртым снапом. 13. За выраб самага вялікага ў свеце габелена. 14. Мемарыяльны комплекс "Курган Славы". 15. Калектыўная дапамога пры выкананні сельскагападарчых работ. 16. Ветраны млын. 17. Здабыча смалы-жывіцы. 18. Міжнародны дзень Маці-Зямлі.*

**ІІІ. Заключны этап**

Настаўнік прапануе паслухаць і асэнсаваць верш Рыгора Барадуліна "Мы – беларусы":

Мы больш сваёй ахвярнасцю вядомы
Мы, беларусы,
Мы – народ такі.
Ахвотна забываем, што мы,
Хто мы.
Згадаюць
Нашай памяці вякі!
Мы сціпласцю сваёй здаўна вядомы,
Саміх сябе хваліць нам не з рукі.
Хай слабакі

Аж падаюць ад стомы,
На плечы ўзяўшы
Пыхі мех цяжкі.
Мы ўсім сваёй гасціннасцю вядомы,
Надзейныя сябры і дружбакі.
І госць, і падарожны ў нас,
Як дома.
А злым і травы колюцца ў бакі.
Гатовы ўсё аддаць –
І тым багаты,
Мы, беларусы,
Мы – народ такі.
Што з краю небяспекі нашы хаты,
Пра гэта
Не забудуць чужакі!

Як асноўная думка твора суадносіцца з пытаннямі і заданнямі сённяшняга квіза? Якія лепшыя традыцыі, факты пра беларусаў ён вам адкрыў? Якім вы бачыце свой уклад у развіццё малой радзімы або ўсёй краіны ў Год добраўпарадкавання?

*Падвядзенне вынікаў квіза.*

**Літаратура**

Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі / уклад. Я. Рапановіч. – Мінск : Вышэйшая школа, 1974. – 381 с.

Лепешаў, І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў беларускай мовы: у 2 т. / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2008. – 2 т.

Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа; пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2016. – 968 с.